# 94 Закон аб далейшым удасканальванні арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам у Беларускай ССР

Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі з задавальненнем адзначае, што прыняты Вярхоўным Советам СССР Закон аб далейшым удасканальванні арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам поўнасцю адпавядае задачам развіцця народнай гаспадаркі СССР на сучасным этапе, інтарэсам далейшага ўмацавання эканамічнай магутнасці краіны і няўхільнага ўздыму дабрабыту совецкага народа.

Унесенае Цэнтральным Камітэтам КП Беларусі і Советам Міністраў Беларускай ССР на разгляд пятай сесіі Вярхоўнага Совета Беларускай ССР пытанне аб далейшым удасканальванні арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам у Беларускай ССР мае важнае значэнне ў справе паспяховага вырашэння задач камуністычнага будаўніцтва.

У выніку паслядоўнага правядзення ў жыццё ленінскай генеральнай лініі на пераважнае развіццё цяжкай індустрыі беларускі народ пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі, у брацкай сям'і народаў Совецкага Саюза за гады Совецкай улады, стварыў магутную соцыялістычную індустрыю, буйную механізаваную сельскую гаспадарку, дабіўся росквіту навукі і тэхнікі, велізарнага эканамічнага і культурнага ўздыму. На аснове поспехаў у развіцці народнай гаспадаркі няўхільна павышаецца жыццёвы ўзровень працоўных.

Інтарэсы развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР патрабуюць далейшага ўдасканальвання арганізацыйных форм і стварэння больш гібкіх метадаў кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, якія даюць яшчэ большы простор развіццю прадукцыйных сіл.

Пераход да новых форм кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам дасць магчымасць палепшыць кіраўніцтва гаспадарчым будаўніцтвам, устараніць шматлікія ведамасныя бар'еры, якія пе-

рашкаджаюць далейшаму развіццю спецыялізацыі, кааперавання ў прамысловасці, найбольш поўнаму выкарыстанню наяўных рэзерваў.

Кіраўніцтва прамысловымі прадпрыемствамі і будоўлямі па тэрытарыяльнаму прынцыпу на аснове эканамічнага адміністрацыйнага раёна, а таксама расшырэнне правоў мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных у кіраванні прамысловасцю азначаюць новы этап у ажыццяўленні ленінскага прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізма ў кіраўніцтве гаспадарчым будаўніцтвам, даюць магчымасць правільна спалучаць цэнтралізаванае дзяржаўнае кіраўніцтва гаспадаркай з разгортваннем ініцыятывы рэспубліканскіх і мясцовых органаў, з павышэннем іх правоў і адказнасці, з яшчэ больш актыўным удзелам шырокіх працоўных мас у кіраванні вытворчасцю. Гэта забяспечыць няўхільны рост матэрыяльнай вытворчасці, паспяховае ажыццяўленне тэхнічнага прагрэсу, найбольш поўнае выкарыстанне рэзерваў у народнай гаспадарцы, павышэнне прадукцыйнасці грамадскай працы, уздым добрабыту народа.

У адпаведнасці з Законам СССР ад 10 мая 1957 года «Аб далейшым удасканальванні арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам» Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі пастанаўляе:

Артыкул 1. Адобрыць распрацаваныя Цэнтральным Камітэтам КП Беларусі і Советам Міністраў Беларускай ССР мерапрыемствы па ўдасканальванню арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам у Беларускай ССР, якія маюць на мэце забяспечыць няўхільны ўздым народнай гаспадаркі рэспублікі, далейшае расшырэнне правоў мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных у гаспадарчым будаўніцтве, набліжэнне кіраўніцтва да вытворчасці, яшчэ больш шырокі ўдзел мас працоўных у кіраванні вытворчасцю, усямернае развіццё іх творчай ініцыятывы ў комуністычным будаўніцтве.

Артыкул 2. Утварыць у Беларускай ССР адзін эканамічны адміністрацыйны раён.

Артыкул 3. Для кіравання прамысловасцю саюзна-рэспубліканскага падпарадкавання ў эканамічным адміністрацыйным раёне Советам Міністраў Беларускай ССР утвараецца Совет народнай гаспадаркі Беларускай ССР у складзе: Старшыні Совета народнай гаспадаркі, намеснікаў Старшыні і членаў Совета.

Артыкул 4. Совет народнай гаспадаркі Беларускай ССР ва ўсёй сваёй дзейнасці падпарадкоўваецца непасрэдна Совету Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 5. Пры Совеце народнай гаспадаркі Беларускай ССР на правах дарадчага органа дзейнічае Тэхніка-эканамічны совет.

Артыкул 6. Структура Совета народнай гаспадаркі Беларускай ССР зацвярджаецца Советам Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 7. Совет народнай гаспадаркі Беларускай ССР у межах сваёй кампетэнцыі выдае пастановы і распараджэнні на аснове і ў выкананне законаў СССР і Беларускай ССР, а таксама пастаноў

і распараджэнняў Совета Міністраў СССР і Совета Міністраў Беларускай ССР.

Пастановы і распараджэнні Совета народнай гаспадаркі Беларускай ССР могуць быць адменены Советам Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 8. Ліквідаваць наступныя Міністэрствы Беларускай ССР:

Аўтамабільнага транспарту;

Папяровай і дрэваапрацоўчай прамысловасці;

Комунальнай гаспадаркі;

Лёгкай прамысловасці;

Лясной прамысловасці;

Мясцовай і паліўнай прамысловасці;

Прамысловасці мясных і малочных прадуктаў;

Прамысловасці харчовых тавараў;

Прамысловасці будаўнічых матэрыялаў.

Артыкул 9. Прадпрыемствы і арганізацыі, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні ліквідоўваемых міністэрстваў, перадаць у непасрэднае падпарадкаванне Совета народнай гаспадаркі Беларускай ССР і мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных па спісу, зацверджанаму Советам Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 10. Перадаць у непасрэднае падпарадкаванне Совета народнай гаспадаркі Беларускай ССР і мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў веданні непрамысловых міністэрстваў Беларускай ССР, па спісу, зацверджанаму Советам Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 11. Даручыць Совету Міністраў Беларускай ССР у адпаведнасці з гэтым Законам устанавіць парадак і тэрміны перадачы ў веданне Совета народнай гаспадаркі Беларускай ССР і мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама абсталявання, сыравіны і іншых каштоўнасцей, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні ліквідоўваемых міністэрстваў.

Артыкул 12. Зацвердзіць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларускай ССР ад 15 мая 1957 года аб ліквідацыі Міністэрства гарадскога і сельскага будаўніцтва, Міністэрства будаўніцтва і аб рэарганізацыі кіравання будаўніцтвам у Беларускай ССР.

Ліквідаваць Дзяржаўны камітэт Совета Міністраў Беларускай ССР па справах будаўніцтва і архітэктуры.

Артыкул 13. Даручыць Совету Міністраў Беларускай ССР у найкарацейшыя тэрміны забяспечыць уладкаванне на работу вызваляемых з апаратаў міністэрстваў, устаноў і арганізацый работнікаў, праявіўшы пры гэтым неабходную ўвагу і клопаты.

Артыкул 14. Устанавіць, што Дзяржаўная планавая камісія Беларускай ССР павінна з'яўляцца навуковым планава-эканамічным органам народнай гаспадаркі Беларускай ССР.

Ускласці на Дзяржаўную планавую камісію Беларускай ССР ажыццяўленне ўсебаковага вывучэння патрэб народнай гаспадаркі і распрацоўку бягучых і перспектыўных планаў развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР з улікам дасягненняў навукі і

тэхнікі, правядзенне адзінай цэнтралізаванай палітыкі ў развіцці галін народнай гаспадаркі і на аснове гэтага забеспячэнне правільнага размяшчэння прадукцыйных сіл на тэрыторыі Беларускай ССР і прапарцыянальнага развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі, а таксама распрацоўку планаў матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння народнай гаспадаркі і забеспячэння кантролю за няўхільным выкананнем дзяржаўнай дысцыпліны ў ажыццяўленні народнагаспадарчага плана.

Артыкул 15. Утварыць Дзяржаўны навукова-тэхнічны камітэт Совета Міністраў Беларускай ССР, усклаўшы на яго вывучэнне дасягненняў айчыннай і зарубежнай навукі і тэхнікі, а таксама перадавога вопыту вытворчасці, ажыццяўленне шырокай прапаганды гэтых дасягненняў, выданне навукова-тэхнічнай літаратуры і кантроль за развіццём і ўкараненнем новай тэхнікі ў народную гаспадарку.

Артыкул 16. У сувязі з перадачай у непасрэднае падпарадкаванне мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных рада прадпрыемстваў і арганізацый, якія знаходзяцца ў веданні ліквідоўваемых міністэрстваў, і ў мэтах сканцэнтравання кіраўніцтва мясцовай прамысловасцю ў абласцях у адным органе, утварыць упраўленні прамысловасці выканаўчых камітэтаў абласных Советаў дэпутатаў працоўных, ліквідаваўшы існуючыя ўпраўленні мясцовай і паліўнай прамысловасці і прамысловасці харчовых тавараў.

Артыкул 17. Увесці дадаткова ў склад Совета Міністраў Беларускай ССР Старшыню Совета народнай гаспадаркі Беларускай ССР, Старшыню Дзяржаўнага навукова-тэхнічнага камітэта Совета Міністраў Беларускай ССР і Начальніка Галоўнага ўпраўлення будаўніцтва пры Совеце Міністраў Беларускай ССР.

Артыкул 18. Устанавіць, што перабудова арганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, прадугледжаная гэтым Законам, павінна быць ажыццёўлена да 1 ліпеня 1957 года.

Старшыня Прэзідыума
Вярхоўнага Совета БССР **В. Казлоў.**

Сакратар Прэзідыума
Вярхоўнага Совета БССР **Д. Лукашэвіч.**

29 мая 1957 года, гор. Мінск.